Такім чынам, прааналізаваўшы вяшчанне радыёканала, трэба павіншаваць «Культуру» з набыццём такога ўзросту, калі ўжо ёсць вопыт, веды, і можна зрабіць адкрыццё сябе свету, аўдыторыі, да якой варта прыслыхоўвацца. Таму адзначым тыя непасрэдныя рэкамендацыі, што вынікаюць з выказаных заўваг:

- павялічыць колькасць матэрыялаў пра сучаснае мастацтва, каб збіраўся фонд з лепшых нацынальных культурных здабыткаў. Думайце пра будучыню!
- палепшыць культуру вяшчання: ні якіх памылак або «плётак» для масавай публікі. Трымайце ганарлівае імя «Культура»!
- паменшыць паўторы перадач, бо жывем у час інтэрнэту, калі трывалая зваротная сувязь з яе «вяртаннем у мінулае», напамінам і каментаром, перамясцілася на сайтавую пляцоўку. Стварайце актыўны камунікатыўны сайт!

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Гісторыя канала «Культура» / Пра «Культуру» // Канал «Культура». Беларускае радыё. – Рэжым доступу: https://www.radiokultura.by/be/content/gistoryya-kanala-kultura. – Дата доступу: 15.11.2021.
2. Малмыга, Т. Региональное радиовещание в условиях реагирования на вызовы в информационной сфере. – Рэжым доступу: http://mediana.by/rubriki/issledovaniya/1886-regionalnoe-radioveshchanie-v-usloviyakh-reagirovaniya-na-vyzovy-v-informatsionnoj-sfere.html. – Дата доступу: 16.11.2021.


## АСАБЛІВАСЦІ ПРАГРАМНАЙ ПАЛІТЫКІ І КАНТЭНТУ РАДЫЁКАНАЛА «КУЛЬТУРА»


**Т. У. Малмыга**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*


Ва ўмовах глабалізацыі, якая характарызуе працэс развіцця сучаснага грамадства, востра паўстаюць праблемы захавання культурнай ідэнтычнасці, парушэнні звыклых культурных сувязей, сціранні рэгіянальных адрозненняў. Шырокае распаўсюджванне атрымліваюць уніфікаваныя стандарты, якія ўспрымаюцца людзьмі як най-

болей эфектыўныя [1]. І менавіта СМІ здольныя садзейнічаць нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі. Якасная медыйная дэманстрацыя культурнага жыцця краіны, традыцый і каштоўнасцяў народа садзейнічае духоўнаму развіццю грамадства і далейшаму раскрыццю яго патэнцыялу.

Створаны ў 2002 г. радыёканал «Культура» Беларускага радыё якраз і ставіць сваёй галоўнай мэтай папулярызацыю спадчыны нацыянальнай і сусветнай культуры. Зыходзячы з гэтага, сфарміравана праграмная палітыка радыёстанцыі, якая накіравана як на захаванне залатога фонду радыёвяшчання, так і на вытворчасць перадач, якія могуць увайсці ў гэты фонд. Сетка вяшчання канала складаецца з улікам часу і мэты размяшчэння праграм у эфіры і арыентавана на змястоўны, пагадзінны, структурны і тэматычны прынцыпы праграміравання, а пры размяшчэнні праграм улічваецца іх папулярнасць.

Канал актыўна развівае аўдыяльныя віды мастацтва – драматургію, літаратуру, музыку, мастацкую публіцыстыку. Што да арганізацыі вяшчання, то тут пераважаюць традыцыйныя структура і формы: інфармацыйныя блокі чаргуюцца з музычнымі, літаратурнымі, публіцыстычнымі праграмамі і творамі радыёдраматургіі. Дарэчы, менавіта літаратурна-мастацкае вяшчанне з’яўляецца найбольш самабытным.

З першага дня сваей работы канал «Культура» рэгулярна транслюе радыёспектаклі з фондаў Беларускага радыё і апошнія пастаноўкі, створаныя на Першым нацыянальным канале. У сетцы вяшчання трывала прапісалася праграма «Радыётэатр плюс», якая знаёміць слухачоў з лепшымі радыёспектаклямі беларускіх і сусветных драматургаў. Яшчэ адна праграма «Дзіцячы радыётэатр» накіравана на выхаванне маладога пакалення на лепшых узорах сусветнай літаратуры, увасобленых у запісах з фондаў Беларускага радыё. Свет опернага мастацтва ззяе новымі фарбамі ў праграме «Музычны радыётэатр». Трэба адзначыць, што ёсць і ўласная вытворчасць літаратурна-мастацкіх праграм для фондаў Беларускага радыё. Гэта, найперш, праекты «Літаратурная анталогія» і «Бестселер», у якіх вядомыя беларускія артысты чытаюць творы беларускай и сусветнай літаратуры. У новым сезоне 2022 года «Бестселер» замяніў «Ранішні серыял» [2].

Асаблівую цікавасць сярод літаратурна-мастацкіх праграм уяўляе праект «Радыё савецкай эпохі» (аўтар і вядучы В. Трапянок), які знаёміць слухача з багатымі фондамі літаратурна-драматычнага вяшчання, створанага ў савецкі перыяд.

Празаічную спадчыну малых формаў сусветных і замежных аўтараў папулярызуе перадача «Літаратурныя гісторыі», пра паэтычную спадчыну класікаў і пачынаючых аўтараў размова ідзе ў перадачы «Прачулым радком». Яшчэ адна праграма «Радыёбібліятэка» прапануе чытанні твораў беларускіх і замежных аўтараў [2].

Аснову кантэнту канала «Культура» складае музычнае вяшчанне, на яго долю прыпадае да сарака працэнтаў эфірнага часу. Прычым гэта часцей за ўсё не проста трансляцыя таго ці іншага канцэрта, але і каментар музыказнаўцы да яго, інтэрв'ю з музыкамі, кампазітарамі, калі гэта канцэрт сучаснай музыкі. Галоўныя функцыі музычнага вяшчання: фармаванне мастацкага густу, знаёмства з лепшымі ўзорамі музычнай класікі і дасягненнямі сучасных кампазітараў і выканаўцаў, стварэнне добрага настрою.

Прэрагатывай канала «Культура» стала акадэмічная музыка, творы сімфанічнага, кантатна-аратарыяльнага, opернага, камернага жанраў. Самы папулярны музычны праект канала – «Канцэртная зала» знаёміць слухача з лепшымі здабыткамі беларускай класічнай музыкі. Ідэя праграмы належыць выпускніку Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Віктару Кісценю. Зараз яго аўтары і вядучыя – Таццяна Песнякевіч, Алесь Вольша.

Адзначым таксама, што праграма «Канцэртная зала» рыхтуецца сумесна з Еўрапейскім вяшчальным саюзам. Таму акрамя лепшых беларускіх выканаўцаў можна пачуць канцэрты еўрапейскіх артыстаў з розных канцэртных пляцовак свету.

Праграма «Класічны рэпертуар» прысвечана шчырым аматарам акадэмічнай музыкі. Аўтар Марына Пагоцкая робіць агляд рэпертуарных і рэдкіх на сцэне твораў, выбірае выдатны ўзор класічнай спадчыны, распавядае пра яго, самога стваральніка або выканаўцу. Класічнай музыцы прысвечаны таксама праекты «Натхнёныя музыкай», «Класіка раніцай», «Гадзіна з класікам» і іншыя [2].

Канал «Культура» актыўна прапагандуе лепшыя ўзоры народнай музычнай культуры. Гэтай тэме прысвечаны праект «Беларуская этнафонія». Яго госці – этнамузыколагі, фальклярысты, лідары фаль-

клорных калектываў і аматары народнай музыкі – расказваюць слухачам пра этнамузычныя традыцыі беларусаў ва ўсім шматабліччы іх праяў, носьбітаў аўтэнтычнай спадчыны. Вядучы – Яўген Талкачоў. Яшчэ адна праграма, звязаная з народнай музыкай – «Гасцінец» журналісткі Таццяны Песнякевіч. Яна прапануе пазнавальныя фальклорныя вандроўкі па Беларусі, знаёмствы з музыкай, песнямі, танцамі, якія суправаджалі традыцыйныя беларускія абрады.

У сетцы вяшчання канала ёсць месца і для іншых музычных напрамкаў. Так, праграма «Рэтра-хіт» прысвечана любімым мелодыям мінулых гадоў. Але акцэнт зроблены на эстрадную і танцавальную музыку. Адзначым, што перадача рыхтуецца выключна па заяўках слухачоў. Ёсць свае прыхільнікі і ў праграм «Музыка тэатра і кіно», «Час на джаз», «Рок назаўжды».

Да 95-годдзя айчыннага вяшчання дырэкцыя канала зладзіла маштабны праект «Радыё: на хвалі мастацтва». Падчас жывых сустрэч у дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы супрацоўнікі канала знаёмілі слухачоў з гісторыяй краіны і айчыннага мастацтва праз гісторыю радыё. Гучалі архіўныя запісы з фанатэкі Беларускага радыё: галасы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Генадзя Цітовіча і іншых выдатных асоб беларускай культуры. Запісы сустрэч прагучалі ў радыёэфіры [2].

Аднак, нягледзячы на разнастайнасць праграм, некаторым відам мастацтва ў эфіры надаецца недастатковая ўвага. Напрыклад, кіно, выяўленчае мастацтва. Гэты недахоп у пэўнай ступені папаўняецца ў публіцыстычных праектах. Абмеркаванне культуралагічных працэсаў у краіне і свеце займае значнае месца ў праграмах радыёстанцыі. Рыхтуюць такія праграмы, як правіла, прафесійныя музыказнаўцы, мастацтвазнаўцы, літаратуразнаўцы. Кампазітары, мастакі, пісьменнікі, паэты, публіцысты як прафесіяналы заўсёды будуць наперадзе, у авангардзе адкрыцця новых шляхоў чалавечых зносін і мастацкага адлюстравання жыцця. Слухачы ўспрымаюць новыя творы мастацтва, але не заўсёды разумеюць усе тонкасці, не заўсёды могуць «прачытаць паміж радкоў». У гэтых умовах мастацкая публіцыстыка, у прыватнасці, у рамках мастацкага радыёканала, дапамагае зразумець і асвоіць новыя формы, сімвалы і канструкцыі прафесійнага мастацтва [3]. У якасці прыкладу можна прывесці праграму «Дыялогі пра культуру». У гэтым сезоне да размовы пра

культурныя падзеі запрашаюць паэт, публіцыст, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Навум Гальпяровіч; журналіст Галіна Шаблінская; мастацтвазнаўца, даследчык сучаснага беларускага мастацтва Мікалай Паграноўскі; журналіст Наталля Сіротка; кандыдат мастацтвазнаўства Уладзімір Трапянок [2].

З 1 верасня 2019 г. у эфіры канала «Культура» – аўдыяверсія праграмы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча, якая выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3». Гэта гутаркі з вядомымі паэтамі, пісьменнікамі, літаратуразнаўцамі пра творчасць, сучасныя тэндэнцыі развіцця беларускай паэзіі і прозы, уздзеянне літаратуры на фарміраванне асобы. Падобная канцэпцыя і ў праграмы Яны Хадоскі «Арт-гасцёўня», толькі яе «суразмоўцы» – мастакі, дырыжоры, рэжысёры. Пра мастацтва, традыцыі і сучаснае жыццё розных народаў свету, пра культурныя падзеі, што адбываюцца ў розных краінах свету, пра вернісажы і канцэрты замежных майстроў мастацтва ў Беларусі і пра жыццё беларускай дыяспары далёка ад роднага дома распавядае праграма журналісткі Ліліі Бялецкай [2]. Адзначым, што асаблівасцю гэтых перадач з'яўляецца іх дыялагічны характар: як правіла, гэта інтэрв'ю, гутаркі, дыскусіі. Шэраг яркіх, на наш погляд, публіцыстычных праектаў «Залатое сячэнне», «Артэфакт», «Маладзёжны ракурс» і іншыя, на жаль, у архіве. А тым часам у эфіры вельмі не хапае праектаў для пэўных груп слухачоў, перш за ўсё для моладзі. Дзіцячае вяшчанне – праграма «ДНК» гэтую нішу не закрывае.

Зыходзячы з сеткі вяшчання канала «Культура», можна канстатаваць, што большая частка перадач стылістычна разлічана на інтэлігентную аудыторыю. Гэта пацвярджае і першы дырэктар канала К. Агеева: «Культура» – гэта радыё для інтэлектуалаў, інтэлігенцыі, найперш творчай, для людзей дапытлівых» [4]. Аднак арыентацыя на «інтэлектуалаў і інтэлігенцыю» патрабуе высокага інтэлекту, прафесійнага ўзроўню, глыбокіх ведаў працэсаў, якія адбываюцца ў сферы культуры і мастацтва. Менавіта таму напачатку сваёй гісторыі канал рабіў стаўку на пазаштатных аўтараў з ліку знакавых асоб беларускай культуры. З «Культурай» супрацоўнічалі музыказнаўцы Вольга Дадзіёмава, Ірына Мільто, Марына Пагоцкая, мастак Сяргей Крыштаповіч, мастацтвазнаўцы Алег Ойстрах, Юрый Іваноў і Мікалай Паграноўскі, літаратуразнаўцы Пятро Васючэнка і Аляксандр Гарбачоў, кінакрытык Людміла Саянкова-Мяльніцкая, музы-

кант і шоумэн Сяргей Пукст і многія іншыя. Ахапіць усе аспекты вельмі шматграннага паняцця «культура» імкнуцца і журналісты радыёканала. Ключ да поспеху ў культурнай журналістыцы – нестандартнае мысленне, уменне аналізаваць і тлумачыць складаныя з'явы зразумелай для аўдыторыі мовай. Менавіта гэтымі якасцямі валодаюць Галіна Шаблінская, Уладзімір Трапянок, Таццяна Песнякевіч, Алесь Вольша, Лілія Бялецкая, Яна Хадоска, Навум Гальпяровіч, Святлана Колмак.

На думку расійскага даследчыка Ю. Салодкамедавай, радыёжурналістыка, якая асвятляе праблемы культуры, як ніякая іншая прафесійная дзейнасць, мае магчымасці садзейнічаць удасканаленню ўзаемаадносін чалавека і соцыуму, развіваць творчую, самастойную асобу. Але для гэтага трэба выкарыстоўваць усе велізарныя магчымасці, якімі валодае сучаснае радыё. І ў першую чаргу такую яго адметную рысу, як інтэрактыўнасць [5]. На жаль, на радыёканале «Культура», нямнога праграм выходзіць у прамым эфіры, а новыя праекты, як правіла, не разлічаны на зносіны са слухачамі. Ды і форма падачы інфармацыі, якая зацвердзілася ў некаторых перадачах, робіць іх сумнымі для людзей 20–40 гадоў, а гэта значыць, што каштоўнасць культурнага паслання не можа быць успрынята адэкватна.

Тым не менш, азіраючыся на 20-гадовую гісторыю канала «Культура», трэба адзначыць, што ён стаў прыкметнай з'явай на медыйным полі краіны, стварыў шэраг значных праектаў аб развіцці нацыянальных культурных працэсаў, спрыяў выхаванню эстэтычных поглядаў і густаў. Але самае галоўнае, набыў верных сяброў і ўдзячных слухачоў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Ясавеев, И. Г. Культурологическая проблематика в СМИ / И. Г. Ясавеев. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://studfiles.net/preview/6187147/page:28/ – Дата доступа: 29.12.2021.

2. Официальный сайт канала «Культура» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://radiokultura.by/be/peredachi. – Дата доступа: 31.12.2021.

3. Яканюк Д. Л. Сучасныя публіцыстычныя жанры і формы электроннай журналістыкі: Вучэбна-метадычны комплекс / Д. Л. Яканюк. – Мн.: БДУ, 2002. – 41 с.

4. Агеева, Е. И. Канал «Культура» – радио для интеллектуалов / Е. И. Агеева. – [Электронный ресурс] Электрон. дан. (54 КБ). – Минск, 2013. – Электрон. опт. диски (CD-ROM

5. Сладкомедова, Ю. Ю. Культурно-просветительские программы на государственном радио: структурно-функциональные и жанрово-тематические особенности / Ю. Ю. Сладкомедова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://cheloveknauka.com/kulturno-prosvetitelskie-programmy-na-gosudarstvennom-radio-strukturno-funktsionalnye-i-zhanrovo-tematicheskie-osobennost#ixzz4rLn0MyVe– Дата доступа: 31.12.2021.

## СПЕЦЫФІКА РАБОТЫ РАДЫЁЖУРНАЛІСТА Ў ПРАМЫМ ЭФІРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАДЫЁКАНАЛА «КУЛЬТУРА»)

**П. А. Нядзвецкая,**
навуковы кіраўнік – Сцяжко Н. Р.
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Выхад у прамы эфір – задача няпростая. Зрабіць гэта якасна можа толькі той журналіст, які мае досыць вопыту і ўпэўненасці ва ўласных сілах. «Прамы эфір – загадзя спланаванае і рэалізаванае распаўсюджванне (паказ, трансляцыя) для перадачы аўдыторыі сацыяльна-значнай інфармацыі ў выглядзе карцінкі, а таксама гукавога суправаджэння, што ажыццяўляецца адначасова з рэальнай падзеяй або дзеяннем, якое ўключае спецыяльна арганізаваную структуру (перадача, праграма) і камунікатыўную дзейнасць вядучага» [1, с. 180].

Што тычыцца прамога эфіру на радыё, то тут справа ўскладняецца адсутнасцю візуальнага складніка. І ў абавязкі журналіста, які выходзіць у прамы эфір, уваходзіць кампенсацыя адсутнасці візуала рознымі гукавымі сродкамі (шумамі, гукавымі эфектамі, джынгламі і т.д.). Улічваючы сучасныя тэндэнцыі, можна назіраць узаемасувязь творчых элементаў радыё-праекта і тэхналагічных магчымасцей, з дапамогай якіх іх можна рэалізаваць. Таксама можна адзначыць, што сёння да прамых эфіраў на радыё ставяцца інакш: яны сталі